COMUS

чэрвень - жнівень 2016

# БЮЛЕТЭНЬ

Стратэгіі развіцця гістарычных гарадоў, арыентаваныя на супольнасці (COMUS)

## Стан развіцця праекту

**Чыатура (Грузія)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

**Душэці(Грузія)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

**Горы(Арменія)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

**Гюмры (Арменія)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

**Луцк (Украіна)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

**Мсціслаў(Беларусь**
Фаза планавання – у развіцці

**Прылукі (Украіна)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

**Сарока(Малдова)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

**Жоўква Украіна)**
Пачатак фазы праекту – выпрацоўка бачання і ПТА

## АСНОЎНЫЯ МОМАНТЫ




**Фаза рэалізацыі праекту COMUS** распачата ў чэрвені 2016 г. Гэтая фаза складаецца з 4 асноўных этапаў: адбору прыярытэтных праектаў, папярэдняй тэхнічнай ацэнкі, тэхніка-эканамічнага абгрунтавання і падвядзення вынікаў. У працяг гэтай фазы, усе пілотныя гарады ў адпаведнасці з іх Рэферэнтнымі (апорнымі) планамі складуць тэхнічную дакументацыю для аднаўлення вылучаных помнікаў, будынкаў ці культурнага краявіду («праекты аднаўлення»). Падчас Фазы кансалідацыі ў 2017 г. адбудзецца мабілізацыя ўсіх партнёраў, стварэнне плана доўгатэрміновага супрацоўніцтва і забеспячэння рэсурсамі.


*Бамберг (Германія), 25-26 ліпеня 2016 г*

**Першы навучальны візіт праекту COMUS** адбыўся ў г. Бамберг (Германія) 25-26 ліпеня 2016 г., Ён быў арганізаваны супольна Арганізацыяй гарадоў Сусветнай спадчыны і Каардынацыйным цэнтрам Сусветнай спадчыны г. Бамберг. Гэты візіт быў прысвечаны практыцы планавання і кіравання спадчынай г. Бамберга.

**Трэці Рэгіянальны семінар у рамках праекту COMUS,** прысвечаны пытанням гарадскога планавання, адбыўся ў Украіне (Кіеў-Прылукі, 4-6 ліпеня 2016 г.). Адкрываючы Фазу рэалізацыі праекту, гэты семінар, у якім прынялі ўдзел 22 прадстаўнікі з 9 пілотных гарадоў, разгледзеў наступныя пытанні: спадчына – рэсурс і адказнасць; спадчына і гарадское планаванне ў Украіне; ўдзел мясцовай супольнасці ў гарадскім планаванні. Семінар завяршыў сваю работу экскурсіяй па гістарычным цэнтры г. Прылукі.




**Брашуры і фільмы** пра пілотныя гарады з'явяцца ў канцы года. Яны будуць асвятляць праекты і тэхніка-эканамічныя абгрунтаванні рэвіталізацыі пілотных гарадоў. Больш канкрэтна, брашуры засяродзяць увагу на абраных гарадах, а фільмы раскажуць пра тэрыторыю праектаў, вызначаную апорнымі планамі, дадуць уяўленне пра адметнасці гарадоў і ўдзел супольнасцей. Брашуры і фільмы разглядаюцца ў якасці асноўных інструментаў для прасоўвання і збору сродкаў для рэвіталізацыі абраных месцаў. **Запрашаем нацыянальных каардынатараў падаваць праекты тэкстаў і сцэнарыяў у Сакратарыят.**

Сайт COMUS пастаянна развіваецца. З чэрвеня 2016 г. тут з'яўляюцца перыядычныя навіны пра апошнія падзеі ў пілотных гарадах. Акрамя таго, былі падрыхтаваныя паштоўкі гарадоў (3 апублікаваныя, 2 у стадыі завяршэння), якія адкрываюць магчымасць прывабнага бачання гарадоў. **Запрашаем нацыянальных каардынатараў працягваць рэгулярна даваць інфармацыю пра развіццё праекту COMUS, а таксама даслаць свае паштоўкі да канца верасня.**

Пасланні на Facebook і мясцовыя СМІ дадаюць новую якасць сайту COMUS.

## Наступныя крокі

**Беларусь**
Семінар з удзелам Вядучага эксперта праекту

**22-23 верасня 2016 г. Арменія**
4й Рэгіянальны семінар па пытаннях кіравання спадчынай

**24-25 кастрычніка 2016 г., Зальцбург (Аўстрыя)**
2а навучальная паездка на тэму: «Камерцыя і бізнэс ў гістарычных месцах»

**Апошні тыдзень кастрычніка 2016 г., Украіна**
Даследаванні

**Кастрычнік 2016 г.**
Семінар па пытаннях тэхнічна-эканамічнага абгрунтавання ў краінах-удзельніцах

**5-25 лістапада 2016 г.**
Місія ЕС па маніторынгу вынікаў

**6 снежня 2016 г., Тбілісі (Грузія)**
Сустрэча Кіраўнічага камітэту

**6-8 снежня 2016 г., Тбілісі/Душэці (Грузія)**
5й Рэгіянальны семінар – Акадэмія мэраў гарадоў



*Трэці рэгіянальны семінар COMUS па пытаннях гарадскога планавання (Кіеў-Прылукі, 4-6 ліпеня 2016 г)*

**Дадатковую інфармацыю пра праект** COMUS **знойдзеце на сайце**

www.coe.int/comus

## Змест Фазы кансалідацыі

Сакратарыят працуе над зместам фазы кансалідацыі, якая будзе збіраць ды аб'ядноўваць вопыт у мэтах распрацоўкі рэкамендацый для распрацоўкі нацыянальнай палітыкі і стратэгій.